# Помнікі археалогіі

*гісторыка-археалагічная даведка*



Тысячагадовую гісторыю мае Кобрыншчына. Яе землі пачалі засяляцца яшчэ да нашай эры. Наш край багаты разнастайнымі стаянкамі і селішчамі, курганнымі і грунтавымі могільнікамі і іншымі археалагічнымі помнікамі – матэрыяльнымі сведчаннямі жыццядзейнасці нашых далёкіх продкаў. Раскопкі археалагічных помнікаў дазваляюць значна папоўніць веды пра гісторыю Кобрыншчыны, атрымаць звесткі пра народную матэрыяльную

і
духоўную культуру, побытавыя рэаліі. Археалагічныя помнікі – адзіная крыніца фактаў з дапісьмовай эпохі Кобрыншчыны,
і
ў гэтым і
х
неацэннае значэнне.

Паводле археалагічных звестак, у межах раёна налічваецца больш за 20 населеных пунктаў, каля якіх размяшчаліся старажытныя стаянкі. Археалагічныя пошукі ўпершыню былі праведзены ў 1889 г. паводле распараджэння галоўнага кіраўніцтва паветаў па Гродзенскай губерні. Мясцовымі жыхарамі і вучонымі была сабрана значная калекцыя прылад працы, прадметаў побыту, зброі і іншых рэчаў першабытнага чалавека.

За 5 км на паўночны ўсход ад вёскі ***Дзівін***, на пясчаных узгорках каля воз. Любань, ва ўрочышчы Града (Дзівінскія пяскі) ***з***ахавалася
***неалітычная стаянка***
.
Выявілі ў 1938 г. Данілевіч і Абухоўскі, абследаваў у 1963-
19
64 гг. У.
Ф. Ісаенка. На стаянцы з
н
ойдзены
н
аканечнікі стрэл, крамянёвыя прылады працы,
мікраліты. Стая
н
ка адносіцца да мезаліту і неаліту.

Неалітычныя старажытнасці на тэрыторыі Кобрынскага раёна выяўлены ў некалькіх месцах: крамянёвыя наканечнікі стрэл і іншыя прылады знойдзены ў згаданай стаянцы каля ***Дзівіна*** і ў пясчаных кар’ерах каля в. ***Хабовічы***. У Варшаўскім археалагічным музеі захоўваецца касцяны наканечнік стралы, знойдзены ў тарфяніку каля в.
***Літвінкі.***
Неалітычнае паселішча складалася з некалькіх жытлаў-хацін, у якіх маглі жыць да дзесяці чалавек.

За 3,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы ***Біндзюга*** на ўсходнім беразе воз. Любань, на пясчаным узвышшы (3 м над узроўнем вады ў возеры) захавалася ***паселішча***, плошча якога каля 0,5 га. Выявіў у 1981 годзе М. У. Бычкоў. Знойдзены крамянёвыя прылады працы і фрагменты ляпной керамікі бронзавага веку.
У агаленнях выяўлены культурны пласт магутнасцю 0,1-0,2 м, у ім знойдзены крамянёвыя прылады працы (наканечнік стралы трохвугольнай формы, 2 скоблі, 2 скрабкі, 3 пласціны, нуклеус) і фрагменты ляпной керамікі бронзавага веку. Матэрыялы зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР (НАН РБ).

На Кобрыншчыне захавалася 5 могільнікаў, у якіх налічваецца больш за 20 курганоў. Гэта невялікія круглыя насыпы вышынёй ад 0,4 да 1,5 м, дыяметрам 4-15 м. Самы вялікі ***могільнік*** знаходзіцца каля ***в. Засімы***.
На жаль, большасць курганоў не захавалася. Яны паступова разбураліся прыродай і асабліва гаспадарчай дзейнасцю чалавека. Менавіта ў апошнія дзесяцігоддзі зніклі ***могільнікі*** каля вёсак ***Басяч, Грушава, Мацы***.
Адзінкавыя пахаванні засталіся яшчэ каля вёсак ***Залессе і Ілаўск.***

У 3,5 км ад вёсцы ***Агароднікі, Батчанскі сельсавет,*** захаваўся ***парны могільнік***. Адзін

насып захаваўся добра, але пашкоджаны. Вышыня да 3 м, дыяметр да 20 м.
Другі насып разараны.

У цэнтры вёскі ***Бародзічы, Гарадзецкі сельсавет,*** з заходняга боку – ***валун***, на якім праглядаюцца надпісы. З паўночнага боку пры ўездзе ў вёску – надмагільны камень з чырвонага граніту, з надпісамі з заходняга боку.



На каменнай глыбе, што ў вёсцы ***Бярозна, Астроміцкі сельсавет,*** выразаны язычніцкія зна кі – пакуль дакладна не расшыфраваныя.

***Каменны комплекс з выявамі і надпісамі***
*(1803 г.)*
.

У вёсцы ***Дзямідаўшчына, Гарадзецкі сельсавет,*** захаваўся цэлы ***каменны комплекс*** з крыжам язычніцкай багіні смерці. У цэнтры вёскі – прамавугольны, з двухбаковымі

надпісамі, з усходняга боку -
каталіцкі
крыж,
з заходняга –
стылізаваная абрэвіятура ІН
S
–таварыства Ісуса
Хрыста – сімвал іезуітаў.

У вёсцы ***Закросніца, Залескі сельсавет,*** на беразе Мухаўца **–** адзіночны ***курган***.

За 3,3 км на паўночны ўсход ад вёскі ***Залессе, цэнтр сельсавета,*** у лесе, за 0,35 км ад скрыжавання лясных дарог ёсць
***курган “Дайніца”***
.
Вышыня яго складае 0,5 м, дыяметр 8 м. Вядомы з канца
19 ст. Абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў
.

У вёсцы ***Засімы, Буховіцкі сельсавет,*** 2 курганных могільнікі. ***Курганны могільнік-1*** р
азмешчаны
з
а 250 м на ўсход ад в
ё
скі, на правым беразе р. Дахл
а
ўка. Вядомы з 19 ст. Абследавалі ў 1961 г. В. В. Сядоў, у 1970
г.
М
**.**
А. Ткачоў, у 1981
г.
М. У. Бычкоў.
М
огіл
ьн
ік
з 29 насы
п
аў у адзін рад цягнецца ўздоўж берага

ракі Дахлаўкі і лясной дарогі
. Курганы авал
ьны
я ў плане (вышыня 1
-
1,5 м, дыяметр 12
-
15 м, самага вялікага адпаведна
–
1,7 м і 20 м). На
сыпы пясчаныя.

***Курганны могільнік-2.*** За 1 км ад вёскі, ва ўрочышчы Шараеў лес знаходзяцца 7 курганаў-насыпаў. Вышыня 0,4 -1,5 м, дыяметр – 3,6-5,3 м. Вядом
ы з канца 19 ст. Абследавалі ў 1961 г. В. Сядоў, у 1970 г. М. А. Ткачоў.

На паўднёвы захад ад вёскі ***в. Ілаўск, Астроміцкі сельсавет,*** злева ад дарогі, за 600 м ад павароту на вёску – ***ку
рганны могільнік***
(2 насыпы). Вышыня – 1,1 м, дыяметр -15 м. Адкрыў і абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў.

У вёсцы ***Каменка, Буховіцкі сельсавет, –*** два ***каменныя комплексы*** (Каменка-1, Каменка-2) з выявамі і надпісамі (1848).

У вёсцы ***Кісялёўцы, цэнтр сельсавета, – курганны могільнік***. За 3 км ад вёскі, ва ўрочышчы Ямішча. 8 насыпаў. Вышыня курганоў. 0,5-1 м, дыяметр 10-20 м. Выявіў у 1960 г. М. А. Салей, абследаваў у 1970 г. М. А. Ткачоў.


УРОЧЫШЧА
КНЯЖАЯ ГАРА